**УДК 811.161.3**

# ПРАДУКТЫЎНЫЯ СРОДКІ ЎТВАРЭННЯ ТРЫВАЛЬНЫХ ПАР ДЗЕЯСЛОЎНЫХ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ

***канд. філал. навук, дац. В.В. МАРШЭЎСКАЯ***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы)***
***e-mail: tina-2010@bk.ru***

*У артыкуле аналізуюцца прадуктыўныя сродкі ўтварэння карэлятыўных трывальных пар дзеяслоўных фразеалагізмаў, вызначаюцца рэгулярныя і малачастотныя афіксы, іх словаўтваральныя магчымасці. Паказваецца, што ўтварэнне дзеяслоўных фразеалагізмаў незакончанага трывання ад дзеяслоўных фразеалагізмаў закончанага трывання пераважае над адваротным працэсам. Аналіз суфіксальнага спосабу ўтварэння карэлятыўных трывальных пар дзеяслоўных фразеалагізмаў выявіў, што суфіксацыя часта суправаджаецца пазіцыйнымі чаргаваннямі галосных або гістарычнымі чаргаваннямі зычных у аснове дзеяслоўнага кампанента фразеалагізма. Шырока распаўсюджаны сярод дзеяслоўных фразеалагізмаў і суплетыўны спосаб утварэння суадносных трывальных пар, апісваюцца і традыцыйныя суплетыўныя асновы дзеяслоўных кампанентаў фразеалагізмаў, і асновы, у якіх гістарычныя чаргаванні моцна змянілі фанетычны склад кораня. Атрыманыя вынікі могуць быць выкарыстаны ў вучэбным працэсе падчас правядзення лекцыйных і практычных заняткаў па сучаснай беларускай мове, а таксама ў лексікаграфічнай і фразеаграфічнай практыцы.*

***Ключавыя словы:*** *фразеалогія, мовазнаўства, дзеяслоўныя фразеалагізмы, катэгорыя трывання, карэлятыўныя трывальныя пары, перфектывацыя, імперфектывацыя, беларуская мова.*

**Уводзіны.** У навуковай літаратуры адносна статусу трывання выказваліся розныя пункты погляду, нават супрацьлеглыя: ад прызнання трывальных пар формамі аднаго дзеяслова (А.М. Ціханаў, М.Ю. Чарткова, М.А. Шалякін і інш.) да сцвярджэння, што катэгорыя трывання адносіцца да словаўтварэння (І.Р. Міласлаўскі). Прамежкавае становішча займалі Ю.С. Маслаў, А.У. Бандарка і іх прыхільнікі. «Традыцыйна кожная аднатрывальная аснова лічыцца асновай асобнага дзеяслова, г.зн. можна казаць пра дзеясловы закончанага трывання і дзеясловы незакончанага трывання. Калі паміж такімі дзеясловамі адсутнічае розніца ў лексічным значэнні, то яны адрозніваюцца толькі граматычна, толькі трываннем. У гэтым выпадку гавораць пра чыста трывальную суадноснасць, пра карэлятыўныя ці суадносныя трывальныя пары (трывальныя дублеты)» [1, с. 375]. У «Рускай граматыцы» даецца наступнае разуменне паняцця трывальнай пары: «Супрацьпастаўленне розных дзеясловаў, якія знаходзяцца паміж сабою ў адносінах словаўтваральнай матывацыі (за рэдкім выключэннем пар, якія ўтвараюцца рознакарэннымі дзеясловамі» [2, с. 584]. Сучасныя даследчыкі дапаўняюць гэтае паняцце: «трывальная пара – гэта супрацьпастаўленне дзеясловаў розных трыванняў (ЗТ і НЗТ), якія маюць тоеснае лексічнае значэнне і знаходзяцца ў адносінах прамой словаўтваральнай матывацыі. Да ліку трывальных адносяцца і суплетыўныя пары» [3, с. 23]. На думку даследчыцы А.Я. Цітарэнка, працэс утварэння дзеясловаў закончанага трывання ад дзеясловаў незакончанага трывання называецца перфектывацыяй, а прэфіксальная трывальная пара можа называцца перфектыўнай; утварэнне дзеясловаў незакончанага трывання ад дзеясловаў закончанага трывання называецца імперфектывацыяй, а суфіксальныя трывальныя пары можна называць імперфектыўнымі [3].

Рэалізацыі катэгорыі трывання дзеяслоўнымі фразеалагізмамі даследчыкі доўгі час не ўдзялялі дастатковай увагі. Першы, хто звярнуў увагу на спрэчныя пытанні, звязаныя з катэгорыяй трывання ў дзеяслоўных фразеалагізмах, быў У.П. Жукаў. Ён заўважыў, што ў складзе асобных дзеяслоўных фразеалагізмаў некаторыя прыстаўкі ўтрымліваюць сваё значэнне [4]. Аднак у фразеалагічным слоўніку[1] гэтым жа аўтарам падаюцца, часам, і несуадносныя трывальныя пары (*бить (забить) ключом* і інш.). У беларускім мовазнаўстве такую ж думку выказаў І.Я. Лепешаў [5]. Пры выданні слоўніка фразеалагізмаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы[2] даследчык улічыў згаданы словаўтваральны фактар асобных марфем дзеяслоўнага кампанента. І.Я. Лепешаў прапанаваў абедзве трывальныя формы дзеяслоўных фразеалагізмаў падаваць у адным слоўнікавым артыкуле: спачатку апісваць загаловачны выраз у форме незакончанага трывання (з паметай «незак.»), а пасля (у сярэдзіне артыкула) прыводзіць гэты ж выраз у форме закончанага трывання – без тлумачэння, але з паметай «зак.» і адпаведным ілюстрацыйным матэрыялам.

Змяншэнне ж трывальных карэляцый у параўнанні з дзеяслоўнымі лексемамі У.П. Жукаў (як і Р.В. Семянкова, А.М. Ціханаў, і інш.) тлумачыў семантычнымі асаблівасцямі фразеалагізмаў [6]. Ф.Я. Ніканавайтэ, даследуючы семантычную прыроду катэгорыі трывання ў працэсуальных фразеалагізмах, прычыны захавання трывальнай суадноснасці аднымі фразеалагізмамі і замацавання іншых выразаў або толькі ў закончаным, або толькі ў незакончаным трыванні, выказала думку, што асаблівасці ў праяўленні трывання ў фразеалагізмах нельга зводзіць толькі да з'явы абмежавання парадыгмы[3].

---

[1] Жуков, В.П. Школьный фразеологический словарь русского языка. / В.П. Жуков, А.В. Жуков. – 2-е изд. – М.: Просвещение, 1989. – 383 с.

[2] Лепешаў, І.Я. Слоўнік фразеалагізмаў. У 2 т. / І.Я. Лепешаў. – Мінск : БелЭн, 2008. – Т. 1.: А–Л. – 672 с.; Т. 2. М–Я. – 704 с.

[3] Никоновайте, Ф.И. Категория вида фразеологических единиц : дис. … канд. филол. наук / Ф.И. Никоновайте. – Челябинск, 1978. – 224 л.

Мэтай нашага даследавання стала выяўленне і апісанне прадуктыўных (а разам з тым праяўляліся і непрадуктыўныя) сродкаў утварэння карэлятыўных трывальных пар дзеяслоўных фразеалагізмаў.

**Асноўная частка**. Катэгорыя трывання ўласціва ўсім дзеяслоўным фразеалагізмам, акрамя тых, якія не маюць апорнага кампанента-дзеяслова (напрыклад, *не ў галаву* (каму) 'не цікавіць каго-н., не з'яўляецца прадметам чыіх-н. клопатаў, думак і пад.', *не ў залік* 'не прымаецца пад увагу, не лічыцца', *на паверхні* 'лёгка заўважаецца, усведамляецца', *ні ў дугу* 'ніяк не згаджаецца, рашуча пярэчыць', *ні (ані) мур-мур* 'абсалютна нічога не гаварыць, не расказваць каму-н.', *у кусты* 'ухіляцца ад непасрэднага ўдзелу ў чым-н., ад адказнасці за што-н.' і інш.) [7]. Некаторыя дзеяслоўныя фразеалагізмы маюць форму толькі незакончанага трывання (у адносінах да дзеясловаў у навуковай літаратуры выкарыстоўваюць тэрмін «абсалютнае незакончанае трыванне» *Imperfektiva tantum* [3]): *цягнуць коўдру на сябе*, *дрыжаць над кожнай капейчынай*, *вышэй галаву трымаць* і інш. [8]. Дзеяслоўны кампанент іншых адзінак мае форму толькі закончанага трывання (у адносінах да дзеясловаў у навуковай літаратуры выкарыстоўваюць тэрмін «абсалютнае закончанае трыванне» *Perfektiva tantum* [3]): *з'есці з трыбухамі* (каго), *накруціць хвост* (каму), *скруціць рогі* (каму) і інш. [9]. Пераважная большасць дзеяслоўных фразеалагізмаў мае суадносныя пары закончанага і незакончанага трывання (амаль 1800 адзінак з агульнай колькасці звыш 2500 дзеяслоўных фразеалагізмаў).

Услед за І.Я. Лепешавым, мы прытрымліваемся думкі, што «фразеалагізмы суадноснай трывальнай пары адрозніваюцца адзін ад аднаго тым, што ў незакончаным трыванні яны абазначаюць дзеянне без паказу на яго мяжу, а ў закончаным – паказваюць на ўнутраную мяжу дзеяння. Параўн., напрыклад: *Як правіла, вінаватыя багацеі выходзяць з вады сухімі* (М. Машара); *Я і так рад, што сухім з вады выйшаў* (К. Крапіва)» [5, с. 17].

Самы прадуктыўны сродак утварэння дзеяслоўных фразеалагізмаў незакончанага трывання ад закончанага – суфіксацыя. Дзеяслоўныя фразеалагізмы незакончанага трывання ўтвараюцца з дапамогай суфікса *-ва-*: *аддаць даніну – аддаваць даніну*, *збіцца з капейкі – збівацца з капейкі*, *падліць смалы ў агонь – падліваць смалы ў агонь*, *не даць у крыўду* (каго) – *не даваць у крыўду* (каго) і інш.; суфікса *-а- (-я-)*: *наступіць на граблі – наступаць на граблі*, *наступіць на душу* (каму) – *наступаць на душу* (каму), *ударыць у галаву* (каму) – *ударацъ у галаву* (каму), *змяніць гнеў на міласць – змяняць гнеў на міласць*, *засланіць вочы* (каму) – *засланяць вочы* (каму), *адчыніць ілбом дзверы – адчыняць ілбом дзверы* і інш. Пры ўтварэнні дзеяслоўных фразеалагізмаў незакончанага трывання ў аснове іх дзеяслоўных кампанентаў могуць адбывацца чаргаванні галосных і зычных. Чаргаванні галосных звязаны са зменай месца націску, чаргаванні зычных маюць гістарычны характар: *усмактаць з матчыным малаком* (што) – *усмоктваць з матчыным малаком* (што), *замесці сляды – замятаць сляды*, *запрэчы ў аглоблі* (каго) – *запрагаць у аглоблі* (каго), *выцерці ногі* (аб каго) – *выціраць ногі* (аб каго), *выпусціць злога джына – выпускаць злога джына*, *купіць ката ў мяшку – купляць ката ў мяшку*, *падставіць плячо* (каму) – *падстаўляць плячо* (каму), *разрадзіць атмасферу – разраджаць атмасферу*, *павысіць голас – павышаць голас*, *расчысціць дарогу* (каму, чаму) – *расчышчаць дарогу* (каму, чаму) і інш.

Ад дзеяслоўных фразеалагізмаў незакончанага трывання з суфіксам *-а-* ўтвараюцца дзеяслоўныя фразеалагізмы закончанага трывання з суфіксам *-ну-*: *раскідаць розумам – раскінуць розумам*, *скідаць маску – скінуць маску*, *пакідаць ззаду* (каго, што) – *пакінуць ззаду* (каго, што), *скідаць з ног* (каго) – *скінуць з ног* (каго), *кранаць сэрца* (чыё, каго) – *крануць сэрца* (чыё, каго), *засыхаць на корані – засохнуць на корані*, *знікаць з вачэй – знікнуць з вачэй* і інш. Кантэксты, у якіх ужываюцца такія адзінкі, прыглушаюць, нейтралізуюць рэальнае значэнне суфікса *-ну-*. Параўн.: *Шэсць чалавек ныраюць у лес і зараз жа знікаюць з вачэй* (= перастаюць быць бачнымі) (Я. Колас); *Гарнастай тым часам знік з вачэй* (= перастаў быць бачным) (Я. Маўр). У дзеяслоўным кампаненце некаторых фразеалагізмаў перад суфіксам *-ну-* выпадае другі зычны ў спалучэннях *ск*, *рт*: *бліскаць вачамі* (на каго) – *бліснуць вачамі* (на каго), *сціскаць у кулак* (каго) – *сціснуць у кулак* (каго), *выціскаць сокі* (з каго) – *выціснуць сокі* (з каго), *звяртаць увагу* (на каго, на што) – *звярнуць увагу* (на каго, на што) і пад.

У нешматлікіх выпадках суфікс *-ну-* надае дзеяслоўнаму кампаненту фразеалагізма адценне аднакратнасці, імгненнасці дзеяння, кантэкставае атачэнне ўзмацняе гэтае адценне, актуалізуе яго: *сыпануць соль на свежую рану* 'расхвальваць каго-н., раптоўна дапячы каму-н. напамінкамі пра што-н. балючае', *глынуць сліну* 'з зайздрасцю глянуць на што-н. спакуслівае, але недаступнае'. Параўн.: *– Эх, – цмокнуў дзядзька, наямося! – Зірнулі хлопцы на Антося і сліну ўсе яны глынулі, паветра носам зацягнулі* (Я. Колас); *Толік глытаў слінкі, калі бачыў Васіля на веласіпедзе, не вытрымліваў, прасіў: – Васіль, дай мне, га?* (М. Гіль). У такіх выпадках актуалізуецца словаўтваральная функцыя гэтага суфікса, адпаведныя змены зведвае канкрэтнае значэнне фразеалагізма, і выразы як фразеалагічныя дэрываты апісваюцца ў асобных слоўнікавых артыкулах. На нашу думку, адценне аднакратнасці маюць і фразеалагізмы *тыцнуць носам* (каго ў што) 'указаць з мэтай павучання, звычайна ў рэзкай форме', *бразнуць дзвярамі* 'выявіць рэзкі пратэст, не дабіўшыся свайго, жаданага', яны могуць таксама лічыцца ўнутрыфразеалагічнымі дэрыватамі і апісвацца як асобныя выразы. Напрыклад: *Думалася, чым так мучыцца, ці не лепей адразу скончыць усе свае пакуты? А перад тым як скончыць, хацелася мне бразнуць мацней дзвярыма* (М. Гарэцкі).

Для ўтварэння дзеяслоўных фразеалагізмаў закончанага трывання выкарыстоўваюцца прыстаўкі. У «Рускай граматыцы» [2] такія прыстаўкі называюцца чыстатрывальнымі, граматыкалізаванымі, семантычна пустымі.

Прадуктыўнымі выступаюць прыстаўкі *па-*: *ставіць у тупік* (каго) – *паставіць у тупік* (каго), *садзіць у галош – пасадзіць у галош*, *ісці на свой хлеб – пайсці на свой хлеб* і інш.; *за-*: *капыліць губу – закапыліць губу*, *без нажа рэзаць* (каго) – *без нажа зарэзаць* (каго) і інш.; *вы-*: *піць горкую чашу да дна – выпіць горкую чашу да дна*, *цягнуць за вушы* (каго) – *выцягнуць за вушы* (каго) і інш.; *з- (с-, са-)*: *валіцца з ног* (ад чаго) – *зваліцца з ног*

(ад чаго), *рабіць выгляд – зрабіць выгляд*, *віць гняздо* (каму) – *звіць гняздо* (каму), *трымаць сваё слова – стрымаць сваё слова*, *хавацца за плечы* (чые, каго) – *схавацца за плечы* (чые, каго), *гнуць у тры пагібелі* (каго) – *сагнуць у тры пагібелі* (каго) і інш. У кантэксце словаўтваральныя магчымасці прыставак у гэтых адзінках прыглушаны, нейтралізаваны. Параўн.: *Бацька заявіў, што на гэтым яго клопаты аба мне скончыліся і што мне пара ісці на свой хлеб* (= (пара) пачынаць жыць самастойна, зарабляючы на сябе) (К. Крапіва); *Падросшы, пайшоў Боня на свой хлеб* (= пачаў жыць самастойна, зарабляючы на сябе), – *памагаў мацеры насіць кош з запалкамі, шпількамі, гузікамі і ніткамі па вёсках* (К. Чорны).

Аднак кантэкст можа актуалізаваць, узмацняць рэальнае значэнне прыставак *па-*, *на-*, *за-*, у такім выпадку прыстаўкі надаюць дзеяслоўнаму кампаненту фразеалагізма адценні пачынальнасці, мнагакратнасці, паўнаты або празмернасці дзеяння: *пайсці рукой* ‘пачаць добра весціся, гадавацца, пладзіцца’, *навастрыць вушы* ‘пачаць уважліва прыслухоўвацца, насцеражыцца’, *зайграць у дудку* (чыю, каго) ‘пачаць дзейнічаць у чыіх-н. інтарэсах’, *надаваць гарбузоў* (каму) ‘шмат разоў адмовіць таму, хто сватаецца’, *пайграць на нервах* (чыіх, каму) ‘параздражняць, панерваваць каго-н. некаторы час’, *запудрыць мазгі* (каму) ‘знарок нагаварыць шмат чаго няправільнага, падманваючы каго-н.’, *намазоліць вочы* (каму) ‘празмерна надакучыць сваёй пастаяннай прысутнасцю, наяўнасцю’ і пад. Такія адзінкі лічацца самастойнымі выразамі (унутрыфразеалагічнымі дэрыватамі) і апісваюцца ў слоўніках у асобных артыкулах. Параўн.: *І такі «капітан» так іграе ў дудку* (= дзейнічае ў чыіх-н. інтарэсах) *галандцам, што лепш не трэба* (Я. Маўр); – *Дарэмна крычыш на чалавека… Думай, што кажаш, начальнік. – І вы ў тую ж дудку зайгралі?* (= пачалі дзейнічаць у чыіх-н. інтарэсах) (Л. Калодзежны).

Прадуктыўным спосабам утварэння суадносных трывальных пар дзеяслоўных фразеалагізмаў з’яўляецца і суплетывізм асноў (з дыяхроннага пункту гледжання): *браць за каўнер* (каго) – *узяць за каўнер* (каго), *браць быка за рогі – узяць быка за рогі*, *брацца за пяро – узяцца за пяро*, *брацца на ўзбраенне* (кім) – *узяцца на ўзбраенне* (кім), *адыходзіць у вечнасць – адысці ў вечнасць*, *абыходзіць за вярсту* (каго) – *абысці за вярсту* (каго), *сыходзіць з рук* (каму) – *сысці з рук* (каму), *ад’ядаць душу* (каму) – *ад’есці душу* (каму), *уваходзіць у свае берагі – увайсці ў свае берагі*, *выходзіць з-пад пяра* (каго, чыйго) – *выйсці з-пад пяра* (каго, чыйго), *даходзіць да вушэй* (чыіх, каго) – *дайсці да вушэй* (чыіх, каго), *прыходзіць на свет – прыйсці на свет*, *пераходзіць рубікон – перайсці рубікон*, *не знаходзіць сабе месца – не знайсці сабе месца*, *зводзіць у магілу* (каго) – *звесці ў магілу* (каго), *падводзіць пад манастыр* (каго) – *падвесці пад манастыр* (каго), *узводзіцца ў квадрат – узвесціся ў квадрат*, *пераводзіць на рэйкі* (чаго, якія) – *перавесці на рэйкі* (чаго, якія) і інш. З сінхроннага пункту гледжання да гэтай групы прымыкаюць і такія трывальныя пары, дзе гістарычныя чаргаванні ў корані дзеясловаў істотна змянілі фанетычны склад слова: *паварочваць – павярнуць*, *садзіцца – сесці*, *станавіцца – стаць*. Такіх пар сярод дзеяслоўных фразеалагізмаў налічваецца звыш 80: *садзіцца на сем сукоў – сесці на сем сукоў*, *садзіцца не ў сваі сані – сесці не ў сваі сані*, *садзіцца ў галош – сесці ў галош*, *садзіцца на свайго любімага канька – сесці на свайго любімага канька*, *станавіцца папярок горла* (каму) – *стаць папярок горла* (каму), *на хвост станавіцца – на хвост стаць*, *станавіцца на дарозе* (чыёй, каму, чаму) – *стаць на дарозе* (чыёй, каму, чаму), *станавіцца сцяной – стаць сцяной*, *зварочваць з дарогі – звярнуць з дарогі*, *пераварочваць усё нутро* (у каго) – *перавярнуць усё нутро* (у каго), *паварочвацца тварам* (да каго, да чаго) – *павярнуцца тварам* (да каго, да чаго), *пераварочвацца дагары нагамі – перавярнуцца дагары нагамі*, *выварочвацца навыварат – вывернуцца навыварат* і інш.

**Заключэнне.** Катэгорыя трывання рэалізуецца ўсімі фразеалагізмамі, якія належаць па сваім катэгарыяльным значэнні да разраду дзеяслоўных і маюць тыповую структуру (стрыжнёвым кампанентам такіх адзінак выступае дзеяслоў). Найбольш прадуктыўнымі сродкамі ўтварэння суадносных трывальных пар выступаюць суфіксы *-ва-*, *-а-*, а таксама суплетывізм асноў (у параўнанні з дзеясловамі, дзе, па назіраннях лінгвістаў, суплетыўны шлях выкарыстоўваецца вельмі рэдка). Прыстаўкі *па-*, *на-*, *за-* могуць быць чыстатрывальнымі, семантычна пустымі; пры функцынаванні ў кантэксце ў некаторых прыставачных дзеяслоўных фразеалагізмах узмацняецца рэальнае значэнне названых прыставак, што ўносіць адпаведныя змены і ў канкрэтнае значэнне фразеалагізма. Гэтую акалічнасць варта ўлічваць пры апісанні дзеяслоўных фразеалагізмаў у лексікаграфічных працах.

ЛІТАРАТУРА


1. Маслов, Ю.С. Избранные труды: Аспектология: Общее языкознание / Ю.С. Маслов. – М.: Языки славянской культуры, 2004. – 840 с.
2. Русская грамматика. В 2 т. / гл. ред. Н.Ю. Шведова. – М. : Наука, 1980. – Т. 1. – 784 с.
3. Титаренко, Е.Я. Основы славянской аспектологии : учеб. пособие / Е.Я. Титаренко. – Симферополь : Изд. дом КФУ, 2020. – 118 с.
4. Жуков, В.П. О знаковости компонентов фразеологизмов / В.П. Жуков // Вопросы языкознания. – 1975. – № 6. – С. 36–45.
5. Лепешаў, І.Я. Катэгорыя трывання ў дзеяслоўных фразеалагізмах / І.Я. Лепешаў // Беларуская лінгвістыка. – 2010. – Вып. 64. – С. 17–25.
6. Жуков, В.П. Русская фразеология / В.П. Жуков, А.В. Жуков. – М. : Высш. шк., 2006. – 408 с.
7. Маршэўская, В.В. Сінтаксічнае функцыянаванне дзеяслоўных фразеалагізмаў з нетыповай структурай / В.В. Маршэўская // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2021. – Т. 66, № 4. – С. 443–449.
8. Маршэўская, В.В. Семантычныя групы дзеяслоўных фразеалагізмаў незакончанага трывання / В.В. Маршэўская // Роднае слова. – 2021. – № 10. – С. 40–42.
9. Маршэўская, В.В. Семантычныя групы дзеяслоўных фразеалагізмаў закончанага трывання / В.В. Маршэўская // Беларуская мова і літаратура. – 2021. – № 8. – С. 50–55.

REFERENCES

1. Maslov, Yu.S. (2004). *Izbrannye trudy: Aspektologiya: Obshchee yazykoznanie [Selected works: Aspectology: General linguistics].* Moscow: Languages of Slavic culture. (In Russ.).
2. Shvedova, N.Yu. (1980). *Russkaya grammatika: v 2 t. [Russian grammar* (in 2 vol)*].* Moscow: The science. (In Russ.).
3. Titarenko, E.Ya. (2020). *Osnovy slavyanskoj aspektologii [Fundamentals of Slavic Aspectology].* Simferopol: KFU. (In Russ.).
4. Zhukov, V.P. (1975). O znakovosti komponentov frazeologizma [On the sign character of phraseological units]. *Voprosy yazykoznaniya [Questions of linguistics] (6),* 36-45 (In Russ.).
5. Lepeshau, I.Ya. (2010). Kategoryya tryvannya y dzeyasloynyh frazealagizmah [Category of the type of verbal phraseological units]. *Belaruskaya lingvistyka* [*Belarusian linguistics*] *(64)*, 17-25. (In Belarus.).
6. Zhukov, V.P. (1986). *Russkaya frazeologiya [Russian phraseology].* Moscow: Prosveshchenie. (In Russ.).
7. Marsheuskaya, V.V. (2021). Sintaksichnae funkcyyanavanne dzeyasloŭnyh frazealagizmaŭ z netypovaj strukturaj [Syntactic functioning of verbal phraseological units with atypical structure]. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk. [Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series]*, *(66, no. 4),* 443–449 (In Belarus., abstr. in Engl.).). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2021-66-4-443-449
8. Marsheuskaya, V.V. (2021). Semantychnyya grupy dzeyasloŭnyh frazealagizmaŭ nezakonchanaga tryvannya [Semantical groups of imperfective verbal phraseological units]. *Rodnae slova [Native word]*, *(10)*, 40-42. (In Belarus., abstr. in Engl.).
9. Marsheuskaya, V.V. (2021). Semantychnyya grupy dzeyasloŭnyh frazealagizmaŭ zakonchanaga tryvannya [Semantic groups of the verbal phraseological units of perfect type]. *Belaruskaya mova i litaratura [Belarusian language and literature]*, *(8)*, 50–55. (In Belarus., abstr. in Engl.).

*Пастyпiў 17.12.2021*

## ПРОДУКТИВНЫЕ СРЕДСТВА ОБРАЗОВАНИЯ ВИДОВЫХ ПАР ГЛАГОЛЬНЫХ ФРАЗЕОЛОГИЗМОВ

***В.В. МАРШЕВСКАЯ***

*В статье анализируются продуктивные средства образования коррелятивных видовых пар глагольных фразеологизмов, определяются регулярные и малочастотные аффиксы, их словообразовательные возможности. Указывается, что образование глагольных фразеологизмов несовершенного вида от глагольных фразеологизмов совершенного вида преобладает над обратным процессом. Анализ суффиксального способа образования коррелятивных видовых пар глагольных фразеологизмов выявил, что суффиксация часто сопровождается позиционными чередованиями гласных или историческими чередованиями согласных в основе глагольного компонента фразеологизма. Широко распространен среди глагольных фразеологизмов и супплетивный способ образования коррелятивных видовых пар, описываются и традиционные супплетивные основы глагольных компонентов фразеологизмов, и основы, в которых исторические чередования сильно изменили фонетический состав корня. Полученные результаты могут быть использованы в учебном процессе во время проведения лекционных и практических занятий по современному белорусскому языку, а также в лексикографической и фразеографической практике.*

***Ключевые слова:*** *фразеология, языкознание, глагольные фразеологизмы, категория вида, коррелятивные видовые пары, перфективация, имперфективация, белорусский язык.*

## PRODUCTIVE METHODS FOR THE FORMATION OF ASPECTUAL PAIRS OF VERBAL PHRASEOLOGICAL UNITS

***V. MARSHEUSKAYA***

*The productive methods for the formation of correlative aspectual pairs of verbal phraseological units are analyzed in the article, as well as regular and low-frequent affixes and their word-building capabilities are defined. It is established that the formation of the imperfective form of verbal phraseological units from perfect verbal phraseological units prevails over the reverse process. The analysis of the suffix method for the forming of correlative aspectual pairs of verbal phraseological units shows that the suffixation is often accompanied by the positional alternation of vowels or historical alternation of consonants in the base of the verbal component. It was found that the suppletive way of forming aspectual pairs is widespread among verbal phraseological units. The author describes the traditional suppletive bases of the verbal components of phraseological units, as well as the bases in which historical alternations have greatly changed the phonetic composition of a root. The results of the article can be applied in the modern Belarusian language lectures and practical classes, as well as in lexicographic and phraseographic practice.*

***Keywords:*** *phraseology, linguistics, verbal phraseological units, grammatical aspectuality, correlative aspectual pairs, perfectivation, imperfectivation, the Belarusian language.*